вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. ІІ Міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 крас. 2014 г. : у 2 ч. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука [і інш.]. – Наваполацк, 2014. – Ч. 1. – С. 227–236.

3. **Мишин, П. И.** Мифологические истоки некоторых традиционных представлений о ведьмах (на примере этнографических материалов Подвинья) / П. И. Мишин // Лепельскія чытанні : матэрыялы VI навук.-практ. канф., Лепель, 17–18 кастр. 2014 г. / [рэдкал.: Я. А. Грэбень, А. У. Стэльмах]. – Мінск, 2014. – С. 59–65.

4. **Салавей, Л.** Пярэварацень / Л. Салавей // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 385.

Мішына В.І. *(г. Полацк)*

ГУЛЬНІ І ЦАЦКІ Ў СІСТЭМЕ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ[1]

У арсенале сродкаў і метадаў народнай педагогікі беларусаў важнае месца належыць гульням. Побач з відавочнай забаўляльнай функцыяй, якая ў сістэме традыцыйнай культуры адназначна не з'яўляецца дамінуючай, «гульня адыгрывала важнейшую ролю ў жыцці дзіцяці, развіцці яго фізічных і разумовых здольнасцей. У гульні дзеці ўдасканальваліся і вучыліся кіраваць сваімі асабістымі паводзінамі. У ёй спасцігаліся маральныя і этычныя нормы, набываліся жыццёва важныя веды, нараджалася пачуццё калектывізму, патрыятызму як вышэйшых маральных якасцей, неабходных любому грамадству» [5, с. 199].

Менавіта гульня як найважнейшы элемент дзіцячай субкультуры, выступае ў якасці галоўнага сродку гарызантальнай культурнай трансмісіі (камунікацыі з аднагодкамі), але разам з тым з'яўляецца спосабам мадэлявання сацыяльных адносін, садзейнічае развіццю разумовых здольнасцей дзіцяці, засваенню працоўных навыкаў і маральных норм традыцыйнай супольнасці (то бок з'яўляецца інструментам трансмісіі вертыкальнай).

Сацыялізацыя і інкультурацыя дзіцяці пасродкам гульні адбываецца па шэрагу кірункаў, сярод якіх, на нашу думку, важнейшымі з'яўляюцца наступныя:

– *засваенне сацыяльных роляў і правіл паводзін паміж людзьмі, мадэляванне рэальных жыццёвых сітуацый* (ролевыя і сітуацыйныя гульні: «У маці і дачку», «У дом», «У вяселле» і да т. п. [1, с. 192, 195]). Як адзначаў

[1] Работа падрыхтавана ў межах праекта БРФФД-РФФД «Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века», дамова № Г20Р-095.

М.Я. Нікіфароўскі, дзіцячыя гульні жыва адклікаліся на змены, што адбываліся ў жыцці вясковай супольнасці: «Так, па меры з'яўлення шашы, чыгункі, тэлеграфа і парахода ў бліжэйшых да іх мясцовасцях у кола дзіцячых гульняў увайшлі "сыша" ці "шыша", "зілезка", "пірахо́д", і трэба бачыць, каб ацаніць умельства гульцоў выслаць дробнымі гладышамі гульнёвую дарожку, умельства перадавога ўдзельніка прарабіць паравознае "чух-чух!", перадаць свісткі, рукамі рухі рычагоў і колаў лакаматыва. Доўгая нітка на тэлеграфных калках і ўмоўныя ўдары пры паторгванні яе ствараюць захапляльную гульню на тэлеграфе» [4, с. 175]. У другой палове XX ст. асартымент гульняў падобнага тыпу пашырыўся ў працэсе гульнёвага пераасэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны, вынікам чаго стала шырокае распаўсюджанне гульняў «у вайну», «у шпіёнаў», «у дыверсантаў», «у немцаў і партызан» [5, с. 229–230]. Вядома, падобныя гульні, паколькі прадугледжвалі выкарыстанне сапраўднай зброі і боепрыпасаў, былі выключна небяспечныя і маглі прывесці да больш ці менш трагічных наступстваў, аб чым сведчаць і палявыя запісы: «*Ці была такая дурная забава, дзе патроны з вайны находзілі ці...?* – Нахадзілі, але, гэта самае, адзін нашоў быў, дык у лоб яму стрэльнула, троху ў лоб тут, з адной стараны ўгнуты быў. Ну, мае ўжо не, ужо не хадзілі, а гэта ўжо быў старэйшы, так ён хадзіў у лес, нашоў, дык там ці ён якую падробіў, гэта самае, прыпяканку ці што, стрэльнула яму…»[2];

– *авалодванне працоўнымі навыкамі*. Па вызначэнні М.Я. Нікіфароўскага, «не можа быць спрэчкі, што большая частка мясцовых гульняў ёсць перайманне і аднаўленне сельскагаспадарчых і хатніх прац дарослых, вольнымі і нявольнымі сведкамі якіх дзеці становяцца ад ранніх дзён. Па прыкладзе старэйшых, сяк-так зробленаю сахой ды бараной дзеці ўзорваюць аршынную плошчу зямлі, сеюць пясчанае насенне, жнуць наторканыя сюды сцябліны травы, вяжуць падабенства снапоў, малоцяць уласнымі самаробнымі цапамі, веюць атрыманы (вядома, уяўны) хлеб – на гэты раз пясок – і ажыццяўляюць з ім далейшыя пераўтварэнні да пячэння хлеба ўключна. Тое ж самае, з падобнымі падрабязнасцямі, адбываецца ў гульнёвым сенакосе, паставе жывёлы (гліняныя каровы, авечкі, свінні без урону справы замяняюцца каменьчыкамі і палачкамі), ва ўзвядзенні будынкаў, загарадзі і да т. п.» [4, с. 175]. Па меркаванні аднаго з інфармантаў, менавіта падобныя перайманальныя гульні паказваюць схільнасці чалавека да тых ці іншых заняткаў: «І вот я гуляю ў пясочку, каля ракі, роблю будачку – пясочку абляплю, акуратнінька нагу выцігну, гэта ўжо мая хата. Альховы сучок – і зроблю такі, як плуг, атвальчык, і я ўжо на каленечках сяджу – гэта мой агарод. Вот туды радок і аттуль вяду. Вот уся жызнь мая і прашла гэта – на земляробстве. Зем-

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (ФА ПДУ): Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С., 1931 г. н., в. Лажані Ушацкага р-на Віцебскай вобл.

ляробам, рольнікам»[3]. Да гэтай жа групы можна аднесці і сюжэтныя гульні тыпу «Мак», «Проса», «Лён», дзе імітуюцца асноўныя этапы таго ці іншага вытворчага працэсу [2, с. 375–377];

– *развіццё фізічных і разумовых здольнасцей, кемлівасці, спрыту, наглядальнасці.* Па вызначэнні М.Я. Нікіфароўскага, для вышэйзгаданай гульнёвай імітацыі вытворчых працэсаў характэрна «спакойная пераймальнасць і несвядомае капіраванне», што не прыводзіць «да гульнёвых мэтаў – узбуджана-ўзрушанага стану духа» [4, с. 176]. Па меркаванні даследчыка, такіх мэт найперш дасягаюць гульні, якія паводле адной з сучасных класіфікацый, адносяцца да рухомых або гульняў з інвентаром: «конікі», «абгонкі», «кулянне», «каток», «жмурушкі», «класы», «скокі» і інш. [4, с. 176–180]; сюды ж можна аднесці гульні, якія патрабуюць спрыту, наглядальнасці, кемлівасці і іншых якасцей: «Секчы капустку», «Куць», «Лопаўкі», «Краскі», Жгуцікі» і да т. п. [2, с. 331, 358–359, 370]. Паводле палявых запісаў, у побыце дзяцей 1930–1940-х гг. прысутнічалі гульні «ў блейкі», «у пікара», «у лапту», «у хованкі», «два-трэці лішні», «у гарэліцу», «у пытку»: «О, якія гульні былі, гэта самае, во дзе кладбішча не заросшае так было, збіраліся ўсе сюды, у блейкі гулялі. <…> Во так во адвядуць круг і тут паложаць палку, а на гэту палку во так палку паложаць і ты стаіш, кійком гэтым дасі, куды яна паляціць, калі далёка – гэта ты выйграў, а калі мала – прайграў, тады хто болей, дальше паляцела, гэты болей іграець, а тады ўжо з гульні выйшла»[4]; «– Ну вот тут у полі, рабята сабіраліся ў пікара. – *Ну, а як?Расскажыце, як у пікара гуляць? Ну вот сабраліся?* – Палкі, палка дліная. – *Недзе метр?* – Можа і болей, адзін стаіць там, а гэтат палку кароценькую, і ты должен збіць, а тады бегчы, і ён упорыць цябе палачкай, ну не балюча ж»[5]; «Раньшэ гульняў было ўсякіх, я пазабывалася. Карагоды, пелі, гулялі ў лапту, у гарэліцу. – *Як у гарэліцу?* – Па парах становяцца ў рад... Ай, ня помню. Адзін уперадзі, бяжыць, крычыць "Гару!" і хто яго паймаіць. Па пары выскаквалі, лавілі. Многа было гульняў усякіх... Усё атышло»[6]; «Называлася пытка. Пасадзяцца адзін каля аднаго, і тады наверх капу, пасцілку такую тканую накінуць, адзін стаіць, і завяжуць рушнік, там тры вузлы і кінуць во, пад ногі, ну адзін аднаму перадаець, перадаець, а гэтых па нагах шукаець, у каго, найдзіць эту пытку, пад якім, тады гэтымі вузламі так зрэжаць, тады гэтыт устаець, шукаіць гэту пытку. Тэлевізараў не было, нада ж чымсьці заняцца»[7];

[3] ФА ПДУ: Зап. Мішына В. І., Мішын П. І. у 2008 г. ад Хаданёнка Г. П., 1928 г. н., у в. Шышкі, Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл.

[4] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С. 1921 г. н. у в. Лажані Ушацкага р-на Віцебскай вобл;

[5] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Навуменка У. Л. 1936 г. н. у в. Двор Зерчаніцы Ушацкага р-на Віцебскай вобл.

[6] ФА ПДУ: Зап. студ. ПДУ Захарэвіч А., Жолудзева П., Тамашэвіч Д. ад Герман Е. В. 1923 г. н. у в. Боркавічы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.

[7] ФА ПДУ: Зап. Аўсейчык У. Я., студ. ПДУ Круткін А., Салаўёў С., Траццякова А. ад Анашкевіч Л. М., 1935 г. н., Глебка Л. В., 1928 г. н., Пахірка Е. В., 1930 г. н. у в. Шо Глыбоцкага раёна.

– *засваенне ведаў аб навакольным свеце* (гульні, дзе імітуюцца асаблівасці паводзін жывёл і птушак, пэўным чынам адлюстроўваюцца прыродныя і сацыяльныя з'явы: «Птушкі ляцяць», «Кароль», «Цар, злодзей і палач», «Французы і беларусы», «Мышка», «Каршун і качкі» і інш. [2, с. 268, 286, 296, 310, 313, 317]);

– *эстэтычнае выхаванне (засваенне дзіцем пачуцця рытму, рыфмы, музычнай гармоніі, эстэтыкі рухаў* («забаўлянкі», «пацешкі», «гушкалкі» для самых маленькіх [1, с. 189–191], гульні з драматычнымі, вакальнымі і харэаграфічнымі элементамі: «Я малюшанькі», «Зязюля», «Ручаёк» і г. д. [2, с. 373, 390–397, 414]).

Неад'емным атрыбутам дзіцячага побыту з'яўляецца цацка. Па вызначэнні С.У. Андрыеўскай (Касцюкевіч), асноўнымі функцыямі традыцыйных цацак з'яўляюцца гульнёвая, эстэтычная, выхаваўчая, інфармацыйная [3, с. 11]. У межах традыцыйнай супольнасці цацкі былі важным інструментам сацыялізацыі дзіцяці, аднак, як сведчаць вынікі навуковых даследаванняў і этнаграфічныя матэрыялы, практычна да сярэдзіны XX ст. у распараджэнні дзяцей былі пераважна самаробныя цацкі: «рэдка пакупная цацка трапляла ў дзіцячы быт і лічылася сапраўдным цудам» [1, с. 187]. У якасці цацак, якімі можна было заняць дзіця ў самым раннім узросце, маглі выступаць любыя прадметы, якія патраплялiся пад руку, у тым ліку і харчовыя (хлебная скарынка, абаранак, пернік, цукерка – «усё, што дзіця… смокча і грызе, асабліва пры прарэзванні зубоў» [4, с. 174]. У далейшым увага дзіцяці скіроўвалася на «лялькі», якімі бывалі «чурачка, павязаная кавалкам тканіны; згорнутае ў трубачку і перавязанае палатно, лыжка, чаранок, шапка, лапаць» [4, с. 174] і іншыя цацкі. Па расказах інфармантаў, дэфіцыт купленых цацак назіраўся і ў часы іх дзяцінства: «– *Ну вот, як Вы маленькая былі, ці былі цацкі ў Вас якія?* – Цацкі, з дашчурачкі выразала цацкі, дашчурачкушчэпачку і так выражаш, як галава і тут, як грудзі, і тут як… – *Ляльку такую?* – Такую ляльку, з трапак круцілі лялькі. – *Самі круцілі?* – Самі круцілі лялькі, не было такіх, ні якіх ігрушак»[8]; «Кукалку з трапак пашыець баба, вот і ўся кукалка. Адкуда ж яны былі»[9]; «За ўсю жызню мне папа купіў такую небальшэнічкую фарфоравую лялечку і гармонік губны. Захацелася мне гармоніка губнага і вот ён купіў мне. І вайна стала і ў мяне гэтыя ігрушкі былі. Во як я іх шанавала. А цяпер што? Купі машыну, ён сечас разабраў, усё нідзе нічога няма»[10].

Як адзначае Л.В. Ракава, «сучасныя дзеці мала ведаюць традыцыйных гульняў, цацак і паступова страчваюць сувязь з сацыякультурным асяроД-

[8] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А., Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С. 1921 г. н. у в. Лажані Ушацкага р-на Віцебскай вобл.

[9] ФА ПДУ: Зап. студ. ПДУ Захарэвіч А. і Жолудзева П. у 2008 г. ад Матылёнак Н. І., 1925 г. н. у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.

[10] ФА ПДУ: Зап. Філіпенка У. С., студ. ПДУ Траццякова А. у 2010 г. ад Хрол Ч. Б., 1926 г. н. і Шалёнак Т. Р. 1956 г. н. у в. Хралы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.

дзем продкаў» [5, с. 234]. Пацвярджаецца гэта і меркаваннем інфармантаў: «а цяпер, цяпер яны ўсе ў камп'ютерах сідзяць. Толькі калі на веласіпедах пакатаюцца і ўся іхняя гульня»[11].

Як паказваюць матэрыялы анкетавання студэнтаў ПДУ, у пачатку XXI ст. асартымент дзіцячых гульняў і цацак вылучаецца істотнай разнастайнасцю. Сярод пералічаных сустракаюцца як гульні традыцыйнага паходжання («прятки», «московские прятки», «догонялки», «казаки-разбойники», «классики»), так і тыя, што не былі ўласцівы традыцыйнай культуры, аднак шырока бытавалі ў другой палове XX ст. («я садовником родился», «мафия», «море волнуется, раз…», «крокодил», «резиночка» і да т. п.)[12]. Нягледзячы на тое, што сучасныя гандлёвыя прадпрыемствы прадастаўляюць надзвычай шырокі асартымент цацак, у дзіцячай субкультуры яшчэ захоўваецца тэндэнцыя да вырабу некаторых цацак самастойна (самаробныя аўтаматы і лукі, папяровыя лялькі і да т. п.)[13].

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларусы :** [у 13 т.] / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 5 : Сям'я. – 374, [1] с.

2. **Гульні,** забавы, ігрышчы / склад. А. Ю. Лозка. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

3. **Касцюкевіч, С. У.** Семантыка і функцыі традыцыйных цацак беларусаў у XIX–XX стст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.07 / С. У. Касцюкевіч ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. – Мінск, 2004. – 24 с.

4. **Никифоровский, Н. Я.** Очерки Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский ; авт. предисл. и сост. А. П. Ващенко. – Минск : Беларусь, 2019. – 271 с.

5. **Ракава, Л. В.** Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 311 с.

[11] ФА ПДУ: Зап. Лобач У. А. і Сумко А. В. у 2020 г. ад Жаваранак К. С. 1921 г. н. у в. Лажані Ушацкага р-на Віцебскай вобл.

[12] Матэрыялы анкетавання студэнтаў ПДУ, праведзенага ў лютым 2021 г. Мішынай В. І. пасродкам тэхналогіі *Google Forms*.

[13] Матэрыялы анкетавання студэнтаў ПДУ, праведзенага ў лютым 2021 г. Мішынай В. І. пасродкам тэхналогіі *Google Forms*.